***Яўген Барышнікаў***

# «МЕСЦЫ САМЫЯ ДУДАРСКІЯ»: СПРОБА КАРТАГРАФАВАННЯ ЗВЕСТАК АБ ДУДАРСКАЙ ТРАДЫЦЫІ «РЭГІЁНУ ВКЛ»[1]

**Уступ.** За апошняе дзесяцігоддзе была знойдзеная ці стала даступнай значная колькасць крыніц інфармацыі, якая тычыцца дудаў на тэрыторыі г. зв. «рэгіёну ВКЛ», пад якім разумеюцца сучасныя Беларусь і Літва, а таксама сумежныя раёны Латвіі, Расіі, Украіны і Польшчы[2]. Некаторыя з гэтых крыніц былі ўведзеныя ў навуковы зварот у адпаведных публікацыях, іншыя збіраліся і распаўсюджваліся паміж энтузіястамі аказіянальна. Але так ці іначай, яны дазволілі досыць пэўна аднавіць канструкцыю інструментаў, іх строй, асаблівасці ўжытку і нават манеру грання. Аднак, што тычыцца паходжання інструмента, арэалу распаўсюду, этнічнай атрыбуцыі і нават наймення — дуда *беларуская, літоўская, літвінская, крывіцкая, руская* — адназначнасці дагэтуль няма.

Некаторую яснасць тут можа ўнесці картаграфаванне дакладна вядомых звестак: гістарычных крыніц, палявых этнаграфічных запісаў, паходжання музейных экзэмпляраў інструментаў і інш. Як заўважыў І. Тынурыст, картаграфаванне распаўсюду міжнацыянальных музычных народных інструментаў надзвычай важнае пры вывучэнні іх паходжання і бытавання, асабліва ў тых выпадках, «калі народны музычны інструмент разглядаецца ў аспекце праблем этнагенэзу таго ці іншага народу» [18]. Аднак, у працах як колішніх, так і сучасных даследчыкаў дударскай традыцыі рэгіёны і месцы, пра якія вядзецца гаворка, звычайна акрэсліваюцца словамі, што часам прыводзіць да няпэўнасці межаў, не зусім карэктнай геаграфічнай, этнічнай, адміністрацыйнай прывязкі.

Такім чынам, мэтай дадзенай працы ёсць нанясенне на геаграфічную карту наяўных на сёння звестак пра дуды і дударскую традыцыю для далейшага аналізу атрыманай карціны ў параўнанні з іншымі геаграфічна вызначанымі аспектамі: рассяленнем этнасаў, дыялектнымі картамі, палітычнымі і этна-культурнымі межамі ў розныя часы і г.д. У якасці асновы для карты былі выкарыстаныя як тэматычныя публікацыі розных даследчыкаў, прысвечаныя дудам, так і асобныя апублікаваныя, але дагэтуль не выкарыстаныя ў дудовым кантэксце згадкі пра дуды і дудароў з навуковай ці мемуарнай літаратуры. Частка картаграфаваных крыніц дагэтуль не была апублікаваная, што будзе адмыслова пазначана далей.

**Металалогія.** Даследуючы дуды рэгіёну, мы сустракаемся з дадзенымі, разнесенымі не толькі ў прасторы і часе, але і адрознымі якасна. Частку з іх у прынцыпе немагчыма картаграфаваць з-за адсутнасці якой-кольвек інфармацыі пра месца фіксацыі. У некаторых іншых крыніцах фігуруюць досыць буйныя арэалы, напрыклад, цэлыя губерні, культурна-гістарычныя рэгіёны ці ўвогуле вядзецца гаворка пра ўсю тэрыторыю існавання народу. Дзеля дакладнасці, у гэтай працы мы адмовіліся ад картаграфавання такіх вялікіх арэалаў, засяродзіўшыся на як мага больш пэўна вызначаных кропках[3].

Такім чынам, большасць кропак на карце нанесеныя паводле назваў канкрэтных населеных пунктаў, наўпрост пазначаных у крыніцах. Некалькі крыніц, у якіх наўпроставая геаграфічная прывязка адсутнічае, усё ж такі атрымалася лакалізаваць па ўскосных звестках[4]. Калі ж месцазнаходжанне населеннага пункта ні дакладна, ні ўскосна ўстанавіць не ўдавалася, на карце пазначаўся адпаведны валасны, гмінны ці, ўрэшце, павятовы цэнтр. Непазбежныя пры такім падыходзе хібнасці нам падаюцца некрытычнымі для агульнай карціны, бо складаюць, як правіла, усяго некалькі кіламетраў, у рэдкіх выпадках прывязкі да павятовых цэнтраў — да некалькіх дзясяткаў.

На жаль, фармат артыкула і аб'ём выкарыстанага матэрыялу[5] не дазваляюць нам прывесці поўны аналіз кожнай асобнай кропкі на карце ці іх поўны спіс. Па магчымасці, мы будзем пазначаць паходжанне дадзеных, спыняцца на найбольш ключавых кропках і даваць спасылкі на адпаведныя публікацыі.

---

[1] Гэтая праца з'яўляецца працягам і папярэднім падсумаваннем водгукаў і абмеркаванняў аднайменнага дакладу, зачытанага аўтарам 12.10.2013 на пасяджэнні адмысловай даследчыцкай панэлі «Дуды рэгіёну ВКЛ» у рамках III Міжнароднага Кангрэса даследчыкаў Беларусі (Універсітэт Вітаўта Вялікага, Каўнас, Літва).

[2] Канструктыўныя і іншыя адметнасці дудаў рэгіёнў, апісаныя, напрыклад, у працах [1, 7, 14, 12, 4, 21, 22]

[3] У дадзенай працы было вырашана адмовіцца і ад фальклорнага пласту: з улікам аб'ёму сабраных за два стагоддзі фальклорных тэкстаў, адэкватны пошук і картаграфаванне фалклорных звестак пра дуды вымагалі б асобнай працы, якая пры тым вывела б даследванне за рамкі акрэсленых задач па канкрэтызацыі рэальнага, а не «міфа-паэтычнага» арэалу. Інакш кажучы, нам было важна як мага больш дакладна зафіксаваць, дзе існавала сама з'ява, а не тое, дзе і як існаваў, распаўсюджваўся і трансфармаваўся міф пра яе ў вуснай народнай творчасці. Гэта тэма для асобнага даследавання.

[4] Так, напрыклад, першае ў этнаграфічнай літаратуры апісанне *канструкцыі* дуды, зробленае Н. Аніміле ў 1848 ці 1850 і апублікаванае ў 1854 [1, с. 245-246], не ўтрымлівае канкрэтных дадзеных пра месца збору інфармацыі. Але паводле рэдактарскай прадмовы К. Д. Кавеліна, Аніміле «описал быт крестьян, живущих обапол почтовой дороги из Себежа в Люцин, почти на тридцати-вёрстном расстоянии от Себежа, до границы Люцинского уезда, на пространстве, примерно тысячи квадратных вёрст» [1, с. 111]. Акрамя вызначэння квадрату ў 30×30 вёрст, з той жа прадмовы вядома, што Аніміле быў вольнаадпушчаным чалавекам памешчыка Паўловічава, чый маёнтак Камянцы і пазначаны ў якасці прыкладнай кропкі прывязкі гэтага апісання. Іншы прыклад ускоснай лакалізацыі — «Камедыя» (1787) К. Марашэўскага, дзе персанаж твора — беларус-селянін — у адным з эпізодаў грае на дудзе і распавядае пра яе [8, с. 311]. На карце пазначанае месца знаходжання Забельскай гімназіі (мяст. Валынцы Дрысенскага павета, цяпер Верхнядзвінскі раён), дзе і служыў прафесарам рыторыкі і піітыкі ксёндз Каэтан Марашэўскі [8, с. 274]

[5] Для пабудовы карты выкарыстана 96 кропак, без уліку карты тапонімаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Тыпы картаграфаваных звестак. Гістарычныя згадкі (мал. 1)**. Большасць звестак «даэтнаграфічных» часоў (да XIX ст.) лакалізуюцца досыць умоўна, але і гэтага дастаткова, каб сцвярджаць, што ў XVI-XVII стст. дуды, імаверна, былі вядомыя на шмат шырэйшым абшары, чым у этнаграфічны час. Аднак, характэрнай асаблівасцю ранніх згадак дудаў на тэрыторыі ВКЛ з'яўляецца адсутнасць інфармацыі пра канструкцыю інструмента, што не дазваляе рабіць высноваў ані пра карэляцыю паміж дудамі «сярэднявечнымі» (г. зв. «нямецкага тыпу») і дудамі «этнаграфічнымі», ні пра распаўсюд апошніх у Новы час ці пагатоў у Сярэднявеччы.

Найбольш цікавымі падаюцца дакладна лакалізаваныя звесткі Паўля Адэрборна, які ў XVII ст. апісваў дуды менавіта ў сялянскім асароддзі ў ваколіцах Дзісны [2, с. 260]. Вялікая канцэнтрацыя звестак і ў пазнейшыя часы, аж да сучаснасці, дазваляе меркаваць пра непарыўнасць дударскай традыцыі у гэтым раёне (пазначаны літарай «А» на карце №3).




*Малюнак 1* – Карта 1




*Малюнак 2* – Карта 2

**Этнаграфічны перыяд (мал. 1).** Да этнаграфічнага перыяду мы аднеслі звесткі, сабраныя і апублікаваныя ад пачатку XIX і да сярэдзіны XX ст. Аказалася, што ня гледзячы на значную колькасць згадак пра дуды ў працах рускамоўных і польскамоўных этнографаў і мемуарыстаў, замежных падарожнікаў таго перыяду, картаграфаванне большасці з гэтых звестак немагчымае з-за агульнасці прыведзеных апісанняў, адсутнасці пазнак пра канкрэтныя месцы фіксацыі той ці іншай з'явы. У лепшым разе размова ідзе пра паветы, часцей — пра цэлыя губерні. Так, дуды згадваюцца ў чатырох з 24 апісанняў вясельных абрадаў, сабраных Шэйнам; тры згадкі лакалізуюцца з дакладнасцю да вёскі, воласці і павета адпаведна [19]. У шырока вядомай працы Раманава адзіная рэлевантная для нашай тэмы інфармацыя — гэта пазнакі пра паходжанне дзвюх дудаў на малюнках [14]. Выключэнне складае тэкст Нікіфароўскага, дзе ўсё ж такі згадваюцца назвы канкрэтных валасцей «*самых дударных*» (Клясціцкая, Юхавіцкая, Зябкаўская) і вёсак (Астраўскія, Кабішча, Казловічы — гл. раён «Г» на карце №3), дзе «*самое дударское гнездо*» [7, с. 6]. А паводле №273 «Віцебскіх губернскіх ведамасцяў» за 1905 г., «дуды действительно не стало, она существует только в некторых деревнях гутовской и вороньской волостей» [5]. Акрамя гэтага, у аснову карты ляглі звесткі з мемуараў Адама Варлыгі [3], Яніса Райніса (паводле [10]), працы Мікалая Аніміле [1], Алены Іваноўскай [20], звесткі з кнігі «Памяць» [9] і інш.

**Сучасныя запісы (мал. 1).** Пры ўкладанні гэтага слою карты выкарыстаныя палявыя запісы з «Полацкага этнаграфічнага зборніка» [11], а таксама запісы паводле публікацыі Т. Кашкурэвіча [4], запісы З. Сасноўскага [15], В. Тухты [17]. З дазволу збіральнікаў былі выкарыстаныя неапублікаваныя раней экспедыцыйныя запісы І. Д. Назінай (1971), З. Скварчэўскага (2009), дадзеныя з уласнага архіва СЭТ (2000, 2003), у тым ліку сабраныя аўтарам асабіста (2012, 2013). Заўважым, што фальклорныя звесткі (тыповыя паданні, былічкі пра дудароў, прымаўкі, згадкі дуды ці дудара ў песнях і пад.) на карту не наносіліся, калі толькі гэта не быў аповед пра нейкага канкрэтнага дудара з тых мясцінаў.

**Месца паходжання інструментаў (мал. 2).** Адной з найважнейшых крыніц інфармацыі з'яўляецца паходжанне аўтэнтычных адзінак інструментаў. На сёння нам вядома пра 20 аўтэнтычных[6] дудаў «рэгіёну ВКЛ», што захоўваюцца у музеях Вільні (7), Пецярбурга (6), Коўна (3), Гродна (1), Лепеля (1), Лудзу (1) і Масквы (1). У некаторых экспанатаў страчаныя дэталі (саплі, рагаўні), ад некаторых засталіся толькі асобныя часткі (напрыклад, кавалкі дудаў з фондаў РЭМ), не ўсе інструменты добра пашпартызаваныя.

[6] Мы не ўлічваем тут «бутафорскую» [16, с. 239] дуду з НГМ РБ, а таксама дуды майстра Лычкоўскага 1970-х гадоў у МСБК і РЭМ, роўна як і дуды пазнейшых майстроў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Паводле музейных запісаў[7], месца паходжання — з той ці іншай ступенню дакладнасці, ад вёскі да павету — прасочваецца толькі для 13 экспанатаў. Акрамя гэтага, у прыватнай калецыі А. Лася захоўваюцца часткі дуды дудара Квецькі Сцеся, месца пражывання якога таксама дакладна вядомае. Мусім зазначыць, што большасць гэтых экспанатаў яшчэ чакаюць свайго руплівага даследчыка. Таксама імаверна, што ў музейных запасніках захоўваецца яшчэ нямала дудаў ці іх асобных частак, пра якія мы пакуль не ведаем.

Акрамя ўласна музейных экспанатаў, вельмі каштоўнымі з'яўляюцца і фотаздымкі аўтэнтычных дудаў, пагатоў калі самі інструменты страчаныя. З прыкладна двух дзясяткаў такіх здымкаў[8] 12 могуць быць лакалізаваныя з дакладнасцю да павета (ці лепей). Акрамя таго, нанясенню на карту паддаецца і паходжанне дзвюх дудаў з адзінага вядомага відэазапісу аўтэнтычных дудароў [13].

Такім чынам, картаграфаванне магчымае для 14 музейных асобнікаў і 14 фотавыяваў аўтэнтычных інструментаў. Пры тым нідзе лакалізацыі адназначна не супадаюць, то бок дуды з фотаздымкаў немагчыма адназначна супаставіць з нейкім захаваным экспанатам[9]. Гэта азначае, што агулам, так ці іначай, нам вядомы знешні выгляд каля трох дзясяткаў аўтэнтычных дудаў.

**Тапонімы.** Дадатковую інфармацыю па тэме дае картаграфаванне тапонімаў з коранем «дуд*»[10]. Аднак, мы мусім прызнаць пэўную ўмоўнасць выкарыстання тапаграфічных дадзеных, бо калі назвы населеных пунктаў *Дуда, Дуды, Дудар*ы і пад., яшчэ могуць, так ці іначай, сведчыць пра распаўсюд дударскай традыцыі, то назвы кшталту *Дудзічы, Дудчына, Дудкі* і пад. маюць больш неадназначную этымалогію. Такім чынам, тапаграфічныя дадзеныя ў гэтай працы носяць выключна ўдакладняючы характар. Тым не менш цікавым падаецца пэўнае супадзенне атрыманае карціны з арэалам распаўсюду дудаў з той этнаграфічнай літаратуры, дзе вядзецца гаворка пра губерні (Віцебскую, Мінскую, Віленскую). Паказальны таксама своеасаблівы прагал па лініі Пінск-Бабруйск-Магілёў, на поўдзень ад каторага тапаграфічная сітуацыя значна менш насычаная.

**Звесткі пра дуды ў сумежных рэгіёнах.** Паколькі арэал распаўсюду традыцыі рэдка супадае з адміністратыўнымі межамі, для паўнаты карціны мы вымушаны былі гэтыя межы пераадолець: картаграфаванне звестак пра дуды на тэрыторыі сучасных Літвы і Расіі зроблена паводле публікацый Руты Жарскене і Ульрыха Маргенштэрна адпаведна і можа разглядацца як ілюстратыўны дадатак да іх артыкулаў і наша падзяка аўтарам за праведзеную працу.

Матэрыялы Р. Жарскене [22] пераканаўча сведчаць пра значную вядомасць дудаў сярод этнічных літоўцаў, прынамсі ў пачатку ХХ ст. Разам з канструктыўнай тоеснасцю лакальных дудаў у Беларусі і Літве, гэта дазваляе сцвярджаць *міжнацыянальнасць* інструмента. Заўважым пры тым, што большасць літоўскіх дадзеных сканцэнтравана на Віленшчыне, зоне найбольш шчыльных беларуска-літоўскіх міжэтнічных кантактаў і ўзаемаўплываў (раён «Д» на карце №3). Выключэнні рэдкія і таму патрабуюць больш пільнага разгляду. Мы мяркуем, што чым далей кропка ад літоўска-беларускай мяжы, асабліва на поўнач Літвы, да мяжы з Латвіяй, тым больш імаверна, што дадзеныя адносяцца ўжо да іншай дудовай традыцыі, набліжанай да «прыбалтыйскага» (ці «лівонскага», па выразе В. Муктапавелса) тыпу дудаў, вядомых, напрыклад, у Курзэмэ. На жаль, павярхоўнасць наяўных дадзеных не дазваляе пакуль праверыць гэтую гіпотэзу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

---

[7] Аўтар шчыра ўдзячны за гэтыя звесткі Гвідасу Ковера, Тодару Кашкурэвічу, Дзянісу Сухому і Алесю Сурбу. Асобная падзяка Айшат Гаджыевай за інфармацыю аб дудах у фондах РЭМ.

[8] Вядзецца гаворка пра здымкі дудаў (пераважна, з дударамі), вядомыя з прац Прывалава [12], Кашкурэвіча [4], Пшэрэмбскага [21], Сасноўскага [15], Жарскене [22], Калацэя і Рэмішэўскага [13] і інш., архіваў РЭМ, BN, ЦНБ НАН РБ, а таксама з перыядычных выданняў першай паловы ХХ ст.

[9] Мы не выключаем падобных супадзенняў для экспанатаў, лакалізаваць якія мы пакуль не можам.

[10] Карту тапонімаў з коранем «дуд*» па Беларусі зрабіў Цімафей Авілін паводле спісу населеных пунткаў і іх каардынат, падрыхтаванага супрацоўнікамі Інстытута геахіміі і геафізікі НАН Беларусі. Картаграфаванне па Цвярской, Смаленскай і Пскоўскай абласцях Расіі выканана аўтарам паводле агульнадаступных інтэрнэт-крыніц.




*Малюнак 3* – Карта 3

Картаграфаванне дадзеных з расійскага боку зроблена паводле артыкула У. Маргенштэрна [6][11]. Як мы ўжо пісалі раней, аўтар актыўна карыстаецца гістарычнымі і палявымі дадзенымі з этнічна беларускіх тэрыторый заходніх Смаленшчыны і Цвершчыны, але атрыбутуе інструмент як «русская волынка», што, на нашу думку, некарэктна [2, с. 265]. Пагатоў паказальна, што картаграфаванне гэтых звестак дэманструе досыць дакладнае супадзенне ўсходніх межаў арэалу вядомасці дудаў з картамі беларускіх гаворак паводле Я. Ф. Карскага (1903) і М. В. Доўнар-Запольскага (1919). Разам з тым, мы не выключаем знаёмства з дудамі і этнічных рускіх сумежных раёнаў у выніку ўплываў менавіта з беларускага боку, бо, як паказвае карта, гэтая тэрыторыя з'яляецца перыферыйнай зонай досыць вялікага і цэльнага абшару (мал. 4).

На вялікі жаль, з-за адсутнасці рэлевантных публікацый з латышскага боку, мы не можам картаграфаваць дуды на тэрыторыі Латгаліі. Маюцца толькі асобныя звесткі пра распаўсюд у Латгаліі таго самага тыпу аднабурдонных дудаў з рагаўнямі, што былі вядомыя па ўсёй Паўночнай Беларусі. Але паводле гэтай інфармацыі і тут відавочны акурат беларускі ўплыў: чаго вартыя ўспаміны Яніса Райніса, які ў дзяцінстве (1870-я) хадзіў на рум слухаць дудароў-плытагонаў з Беларусі, якія сплаўлялі лес па Дзвіне[12], а таксама апісанні дуды ў латгальскіх беларусаў Сахарава і нават фотаздымкі такой дуды з в. Іоніны Пустынскай гміны[13]. Тым не менш, мы не гатовыя пакуль адназначна сцвярджаць этнічную прывязку інструмента ў Латгаліі і не выключаем патэнцыйнай наяўнасці дудароў і сярод этнічных латышоў.

Што тычыцца памежных рэгіёнаў з Польшчай і Украінай, то дадзеныя пра дуды там адзінкавыя і вельмі неканкрэтныя.

**Замест высноваў**

[11] Далучыць звесткі Маргенштэрна да «рэгіёну ВКЛ» дазваляе прыналежнасць часткі даследаваных ім тэрыторый да беларускага лінгвістычнага арэалу і адпаведная зафіксаваная ім тэрміналогія: «дуда» (а не «валынка»). Мы не нанеслі на карту тры кропкі з паўднёвай Пскоўшчыны, бо аўтар сам прызаецца, што зафіксаваныя там фальклорныя дадзеныя (прымаўкі) — ускосныя і хутчэй сведчаць пра «незнание волынки» [6, с.179]

[12] Месца пазначана ў раздзеле этнаграфічных дадзеных. Цытуецца паводле [10].

[13] Здымак захоўваецца ў А. Сурбы і неўзабаве будзе ўведзены ім у навуковы зварот.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Па-першае, заўважым супадзенне дадзеных з розных пластоў у некалькіх раёнах (пазначаны на карце №3 літарамі). З тых мясцінаў інфармацыя найбольш поўная: ёсць і музейныя экспанаты, і фотаздымкі, і нават прозвішчы канкрэтных дудароў[14]. Аднак, мы мусім прызнаць, што нераўнамернасць выбаркі дадзеных не дазваляе казаць пра завершанасць ці поўную карэктнасць карты. Некаторыя рэгіёны сапраўды даследаваныя на прадмет дудаў значна больш, чым іншыя, адпаведна і інфармацыйная шчыльнасць там вышэйшая. Таксама карэктнасці дзеля варта было б вызначыць і рэгіёны, дзе звестак пра дуды паводле тэматычных аптытанняў не зафіксавана ўвогуле. На жаль, гэта немагчыма з-за адсутнасці даследаванняў такога маштабу. Зважаючы на гэтыя фактары, аўтар просіць лічыць атрыманыя вынікі папярэднімі і разлічвае на з'яўленне новых дадзеных, якія ўдакладняць арэал.

Пакуль жа вышэй пералічаныя дадзеныя, сабраныя ўсе разам (мал. 3), даюць досыць дыскрэтную і, на першы погляд, хаатычную карціну. Але камп'ютарная інтэрпаляцыя гэтых кропак дазваляе не проста акрэсліць арэал распаўсюду дудаў паводле вядомых звестак, але і вызначыць месцы найбольшай іх канцэнтрацыі (мал. 4). Такім чынам, мы назіраем некалькі зонаў павышанай інфармацыйнай шчыльнасці, «месцаў самых дударскіх». Найперш, гэта тлустая паласа па лініі Барысаў-Лепель-Дзісна-Себеж. Тут самая высокая шчыльнасць дадзеных і толькі тут фіксуюцца звесткі пра дуды ад XVII ст. і аж да сучаснасці. Можна сказаць, што гэта і ёсць найбольш імавернае ядро дударскай традыцыі рэгіёну. Прыкладна роўнымі як па памерах, так і па шчыльнасці дадзеных выступаюць два іншыя «гнязды дударства»: гэта ваколіцы Свянцянаў і Лабаноры на літоўска-беларускім памежжы і Гарадоцкі раён Віцебскай вобл.



*Малюнак 4* – Карта 4

У цэлым, атрыманы арэал распаўсюду дудаў паводле наяўных звестак аказваецца досыць цэльным. Ён цягнецца з Гарадзеншчыны, праз Віленшчыну і Латгалію, ахоплівае ўсю Паўночную і ладную частку Цэнтральнай Беларусі, а таксама Заходнія часткі Смаленшчыны і Цвершчыны. На поўначы і паўночным усходзе мяжа гэтага рэгіёну супадае з межамі беларускіх гаворак. Разам з тым, нельга сказаць, што арэал распаўсюду дудаў цалкам супадае з беларускім этна-лінгвістычным абшарам: паўднёва-ўсходняя мяжа арэалу досыць размытая і, магчыма, карэлюе з тэрыторыяй рассялення балцкіх плямёнаў. Аднак больш дакладныя высновы патрабуюць удумлівага супастаўлення атрыманага арэалу з лінгвістычнымі, адміністратыўнымі, археалагічнымі, гісторыка-культурнымі і іншымі картамі рэгіёну. Перспектыўным таксама падаецца разгляд арэалу ў храналагічным кантэксце, што дапаможа выявіць дынаміку працэсаў у акрэсленым абшары, прасачыць змены шуканага арэалу рапаўсюду дударскай традыцыі і вызначыць кірункі міжэтнічных уплываў. Пакуль жы мы ўстрымаемся ад падобных гіпотэз, пакінуўшы іх на сумленні чытача.

Адно можна сказаць ужо цяпер: тоеснасць канструкцыі музейных экспанатаў разам з цэльнасцю атрыманага арэалу і этнічнай, моўнай, культурна-гістарычнай разнастайнасцю на гэтых землях дазваляюць сцвярджаць *міжнацыянальнасць* інструмента, прыналежнасць яго да рэгіёну, а не да этнасу, хаця ў гістарычнай перспектыве этнічныя ўплывы і маглі мець месца.

**P.S. Зварот да чытача.** Досвед камунікацыі з даследчыкамі і аматарамі дудаў дазваляе нам канстатаваць выпадкі, калі інфармацыя застаецца не ўведзенай у навуковы зварот. Многае з пачутага ў падарожжах ці экспедыцыях так і застаецца неапублікаваным. І хаця тыповая байка пра дуду ці зацемка ў мясцовай газеце сама па сабе можа падавацца нязначнай, недастатковай для навуковай сенсацыі ці нават

[14] Так, напрыклад, з раёна «Б» (ваколіцы Празарокаў і возера Шо) паходзіць дудар, што граў у тэатральнай трупе Ігната Буйніцкага. Раён «В» (Барысаўшчына) вядомы сваім дударом Стахванам Шахаўцом.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

артыкула, такія дадзеныя, сабраныя разам, могуць дапамагчы вырашыць сур'ёзныя пытанні паходжання і распаўсюду інструмента і традыцыі. Таму, карыстаючыся выпадкам, аўтар просіць чытачоў паведамляць нават пра такія адзінкавыя, дробныя выпадкі на адрас eugen.baryshnikau@gmail.com.

**Скарачэнні:**

BN — Biblioteka Narodowa (Польская Нацыянальная Бібліятэка), Варшава
LNM — Lietuvos nacionalinis muziejus (Нацыянальны музей Літвы), Вільня
МАЭ РАН —Музей антрапалогіі і этнаграфіі імя Пятра Вялікага Расійскай акадэміі навук, СПб
МСБК — Музей старажытнабеларускай культуры, Мінск
НАН — Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Мінск
НГМ РБ — Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь, Мінск
РЭМ — Расійскі Этнаграфічны музей, Санкт-Пецербург
СЭТ — РМГА Студэнцкае этнаграфічнае таварыства, Мінск
ЦНБ НАН — Цэнтральная навуковая бібліятэка Нацыянальнай акадэміі навук, Мінск

**Спіс літаратуры:**


1. Анимелле, Н. Быт белорусских крестьян / Н. Анимелле // Этнографический сборник. – СПб., 1854. – Вып. 2. – С. 245–246.
2. Барышнікаў, Я. Дуды на тэрыторыі Беларусі ў працах замежных аўтараў / Я. Барышнікаў // Аўтэнтычны фалклор : праблемы захавання, вывучэння, успрымання : зб. навук. прац. удзел. VII Міжнар. навук. канф. – Мінск : БДУКМ, 2013. – С. 259–266.
3. Варлыга, А. Карэншчына. Успамін-нарыс з канца XIX — пачатку XX ст. / А. Варлыга // ЛіМ. – 1994. – № 14. 8 красав.
4. Кашкурэвіч, Т. Літоўская дуда. Інструмент-міф / Т. Кашкурэвіч // DRUVIS : альманах Цэнтра Этнакасмалогіі KRYŬJA. – 2008. – № 2. – С. 101–112.
5. Кирмаши // Русская музыкальная газета. – 1906. – № 1. – С. 15.
6. Моргенштерн, У. Волыночные наигрыши у русских гармонистов / У. Моргенштерн // Северобелорусский сборник: Обряды, песни, наигрыши, плачи, ворожба : сб. науч. ст. и материалов / ред.-сост. А. В. Ромодин. – СПб., 2012. – Вып. 1. – С. 168–208.
7. Никифоровский, Н. Я. Очерки Витебской Белоруссии. Дударь и Музыка / Н. Я. Никифоровский // Этнограф. обозрение. – М., 1892. – Вып. 2.
8. Перетц, В. Н. К истории польского и русского народного театра. XVIII—XIX / В. Н. Перетц // Известия Отделения русского языка и словесности Императорской Академии наук. — СПб., 1911. — Т. XVI, кн. 3. — С. 248–319.
9. Памяць: Браслаўскі раён : гіст.-дакумент. хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. – Мінск, 1998. – С. 67.
10. Панізнік, С. Браніслава : дакумент. аповесць. – Мінск : Юнацтва, 1985. – 59 с.
11. Полацкі этнаграфічны зборнік / уклад., прадм. і паказ. У. А. Лобача : у 2 вып. – Наваполацк : ПДУ, 2011. – Вып. 2 : Народная проза беларусаў Падзвіння. – 271 с. : іл.
12. Прывалаў, Н. Беларускія народныя інструменты / Н. Прывалаў. –Мінск, 1928. – 184 с.
13. Ремишевский, К. И. Белорусская дуда в кинохронике 1930-х годов (по материалам киножурнала «Советское искусство» № 7, 1939 г.) / К. І. Рэмішэўскій, В. В. Калацей // NB: Культуры и искусства. – 2013. – № 4. – С. 81–92.
14. Романов, Е. Вымирающий инструмент / Е. Романов // Виленский календарь на 1910 год. – С. 123–129.
15. Сасноўскі, З. Старыя інструменты Беларусі [кінастужка] / З. Сасноўскі // МГА : згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына». – 2007. – 25 хвіл.
16. Сурба, А. Асаблівасці традыцыйных дуд з музейных калекцый Беларусі / А. Сурба // Аўтэнтычны фалклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання : зб. навук. прац удзел. V Міжнар. навук. канф. – Мінск : БДУКМ, 2011. – С. 238–240.
17. Тухта, В. У. Дзе Байна сустракаецца з Эсай : народная проза Лепельшчыны / В. У. Тухта. – Мінск : Медисонт, 2013. – 98 с.
18. Тынурист, И. В. Где во гусли звонили? (опыт картографирования народных музыкальных инструментов) / И. В. Тынурист // Этнографические исследования Северо-Запада СССР. Традиции и культура сельского населения. Этнография Петербурга. – Л. : Наука, Ленинград .отд., 1977. — С. 16–29.
19. Шейн, П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края / П. В. Шейн. – СПб., 1890. – Т. 1, ч.2.
20. Iwanowska, I. Some White Russian Folksongs / Iwanowska I., Onslow H. // Folk-lore. – London,1914. – Vol. 25. – P. 91–109.
21. Przerembski, Z. J. Dudy: instument mało znany polskim ludoznawstwom / Przerembski Z. J. – Warszawa, 2007.
22. Žarskienė, R. Užmirštieji muzikos instrumentai: dūdmaišis ir Lietuva / Žarskienė R. // Tautosakos darbai. – Vilnius : LLTI, 2011. – T. XLII. – C. 194–222.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ